# 10 КЛАС

**1. Паводле пададзенай транскрыпцыі зрабіце арфаграфічны запіс фрагмента рэпартажу пра свята роднага слова, якое прайшло ў Быхаве.**

[рас’ійск’і п’іс’м’эн’н’ік / дарэчы / ураджэн’эц маг’іл’оўшчыны / і м’эцэнат вал’эрый казакоў часта прыйажджайэ ў б’эларус’ на дз’эн’ п’іс’м’энства / таму с’ол’эта йон адзначыў / в’эл’м’і прыйэмна / што с’в’ята вандруйэ з аднаго м’эсца ў йіншайэ ды ўваскрашайэ кул’туру мал’эн’к’іх б’эларуск’іх гарадоў //]

***Заўвага***: знак / абазначае тактавую паўзу ў межах сказа, знак // – міжфразавую паўзу.

*. Расійскі пісьменнік (дарэчы, ураджэнец Магілёўшчыны) і мецэнат Валерый Казакоў часта прыязджае ў Беларусь на Дзень пісьменства, таму сёлета ён адзначыў:*

*– Вельмі прыемна, што свята вандруе з аднаго месца ў іншае ды ўваскрашае культуру маленькіх беларускіх гарадоў.*

***Заўвага:** допускаецца варыянтнае пунктуацыйнае афармленне простай мовы і ўстаўной канструкцыі.*

**4,5 бала** за правільны запіс. За кожную арфаграфічную ці пунктуацыйную памылку –0,5.

**2. Паводле акустычнай тэорыі склада, усе гукі мовы знаходзяцца на розных узроўнях гучнасці. Згодна з гэтай тэорыяй, найвышэйшую ступень гучнасці – чацвёртую – маюць галосныя гукі, санорныя зычныя – трэцюю, звонкія зычныя – другую, глухія – першую. Такім чынам, кожнае слова можна прадставіць як паслядоўнасць нумароў узроўняў гучнасці. Напрыклад, слова *дом* можна адлюстраваць у схеме 2-4-3.**

**Пабудуйце схемы ўзроўняў гучнасці для слоў, якія з’яўляюцца адказамі на прапанаваныя пытанні.**

| Пытанне | Адказ | Схема гучнасці |
|---|---|---|
| 1. Мастацкі троп, замена аднаго слова ці выразу іншым на аснове знешняй ці ўнутранай сувязі паміж з’явамі. | *метанім ія* | *3-4-1-4-3-4-3-4-3-4* |
| 2. Як называецца двухскладовая стапа з націскам на другім складзе? | *ямб* | *3-4-3-1* |
| 3. Гаворка адной асобы, звернутая да слухачоў ці да самога сябе. | *маналог* | *3-4-3-4-3-4-1* |
| 4. Назва адзінага прыжыццёвага зборніка вершаў Максіма Багдановіча. | *“Вянок”* | *3-4-3-4-1* |
| 5. Від літаратуразнаўчага, крытычнага або філасофскага артыкула ў свабоднай форме. | *эсэ* | *4-1-4* |

**7,5 бала**; па 1 за кожны правільны адказ і па 0,5 за кожную правільную схему.
***Заўвага!*** Пры няверным адказе схема ўзроўняў гучнасці не правяраецца.

**3. У беларускай мове шэраг назоўнікаў мае фіналь (заканчэнне) –іва (–ыва). Устанавіце, якія назоўнікі з гэтай фіналлю маюць такое значэнне.**

| Назоўнік з фіналлю *–іва (–ыва)* | Лексічнае значэнне |
|---|---|
| *каліва* | ‘асобна ўзятая расліна, сцябліна, саломіна і пад.’ |
| *покрыва* | ‘верхні слой, які пакрывае, ахутвае сабой што-небудзь’ |
| *печыва* | ‘печаныя вырабы з мукі’ |
| *зарыва* | ‘водбліск пажару або заходу сонца на небе’ |
| *паліва* | ‘гаручае рэчыва, якое дае цяпло і з’яўляецца крыніцай атрымання энергіі’ |
| крэсіва | ‘кавалак сталі для высякання агню з крэменю’ |

**6 балаў**; па 1 за кожнае слова.

**4. Пастаўце прапанаваныя колькасныя лічэбнікі ў форме творнага склону і ўтварыце ад іх парадкавыя.**

| Колькасны лічэбнік | Форма творнага склону | Адпаведны парадкавы лічэбнік у пачатковай форме |
|---|---|---|
| восемдзесят | *васьмюдзесяццю* | *васьмідзясяты* |
| дваццаць адзін | *дваццаццю адным* | *дваццаць першы* |
| дзве тысячы | *дзвюма тысячамі* | *двухтысячны* |
| паўтара | *паўтара* | *паўтарачны* |
| сем | *сямю* | *сёмы* |

**7 балаў;** па 0,5 за кожную правільна запоўненую клетку (14*0,5).

| | | | |
|---|---|---|---|
| сорак | *сарака* | *саракавы* | |
| трыста | *трымастамі* | *трохсоты* | |
| | | | |

| | |
|---|---|
| **5. Вызначыце ў пададзеных назвах артыкулаў з беларускіх СМІ граматычныя асновы і ахарактарызуйце сказы (двухсастаўны – аднасастаўны (від аднасастаўнага)).** | **6 балаў;** па 0,5 за кожную правільна запоўненую клетку (12*0,5). |

| Сказ | Граматычная аснова | Характарыстыка сказа |
|---|---|---|
| 1. «Іпэшнікі» аказаліся не гатовымі... | *«іпэшнікі» аказаліся не гатовымі* | *двухсастаўны* |
| 2. Не стала вёскі за адзін дзень. | *(не) стала* | *аднасастаўны (безасабовы)* |
| 3. На паштовых марках прыгоды Несцеркі, парасяці і іншых. | *прыгоды* | *двухсастаўны* |
| 4. Двухпавярховыя цягнікі пачалі курсіраваць па чыгунках Расіі. | *цягнікі пачалі курсіраваць* | *двухсастаўны* |
| 5. А суддзі хто?.. | *суддзі хто* | *двухсастаўны* |
| 6. «Пандэмію» спынілі на мяжы. | *спынілі* | *аднасастаўны (няпэўна-асабовы)* |

| | |
|---|---|
| **6. Многія народныя выслоўі з'яўляюцца рыфмаванымі. Аднавіце прапанаваныя прыказкі па апошнім слове і значэнні.** | **7,5 бала;** па 1,5 за кожную правільную прыказку. Пры правільным падборы рыфмы, але няверна й прыказцы можна ацаніць адказ у 0,5 б. |

| Прыказка | Апошняе слова ў прыказцы | Значэнне / ужыванне прыказкі |
|---|---|---|
| *Дома і салома ядома.* | …ядома | Дома, у прывычных абставінах жыць лягчэй, чым дзе-небудзь у іншых умовах. Ужываецца звычайна тады, калі гаворыцца пра харчаванне, ежу. |
| *Калі (як) топішся, дык (то) за брытву (саломку) схопішся.* | ...схопішся | У бязвыхадным становішчы, калі няма выбару, звяртаешся нават да безнадзейнага сродку. |
| *Не ў службу, а ў дружбу.* | …ў дружбу | Кажуць, калі просяць зрабіць паслугу па дабрыні, а не па абавязку. |
| *На чужой старонцы рад сваёй варонцы.* | …варонцы | Гаворыцца з задавальненнем пры сустрэчы з земляком у чужой мясцовасці. |
| *Гаспадарку весці – не лапці плесці.* | …плесці | Гаспадарка патрабуе вялікіх клопатаў. |

| | |
|---|---|
| **7. Твітар (англ. Twitter) – сістэма, якая дазваляе карыстальнікам адпраўляць кароткія тэкставыя паведамленні да 140 графічных сімвалаў, якімі з'яўляюцца літары, апостраф, знакі прыпынку і прабелы паміж словамі. Напрыклад, у першым радку паэмы "Курган" (*Паміж пустак, балот беларускай зямлі,*) такіх сімвалаў 37. Падлічыце, колькі поўных радкоў наступных вершаваных твораў могуць змясціцца ў адным твітараўскім паведамленні (лічыць трэба з першага радка верша). Укажыце аўтараў гэтых твораў.** | **6,5 бала;** па 2,5 за кожную правільна ўказаную колькасць радкоў (2,5*2); па 0,5 за кожнага правільна ўказанага аўтара (0,5*3). |

| Вершаваны твор | Колькі радкоў | Аўтары |
|---|---|---|
| Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь | *4* | *М. Клімковіч, У. Карызна* |
| "Маёвая песня" ("Па-над белым пухам вішняў") | *6* | *М. Багдановіч* |

<table>
<tr>
<td>

**8. У 1957 г. была заснавана Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы – за лепшыя творы паэзіі і драматургіі. Хто з названых беларускіх літаратараў быў уганараваны гэтай прэміяй і за што?**

***Літаратары***: *Максім Багдановіч, Раіса Баравікова, Васіль Быкаў, Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Мікола Мятліцкі, Алаіза Пашкевіч, Язэп Семяжон, Максім Танк, Іван Шамякін.*

| Лаўрэат прэміі | За што ўганараваны |
|---|---|
| *Максім Танк* | за зборнікі паэзіі “След бліскавіцы”, “Мой хлеб надзённы” |
| *Кандрат Крапіва* | за камедыю “Брама неўміручасці” |
| *Раіса Баравікова* | за кнігу паэзіі “Люстэрка для самотнай” |
| *Язэп Семяжон* | за пераклад паэмы М. Гусоўскага “Песня пра зубра” |
| *Мікола Мятліцкі* | за кнігу вершаў “Бабчын: кніга жыцця” |

</td>
<td>5 балаў; па 1 за кожную правільна запоўненую клетку (5*1).</td>
</tr>
<tr>
<td></td>
<td>50 балаў</td>
</tr>
<tr>
<td>Пры праверцы заданняў варта ўлічваць арфаграфічныя, граматычныя і іншыя памылкі. За кожную з іх рэкамендуецца здымаць 0,1 бала ў тых заданнях, якія ацэнены станоўчым балам.<br>Заўвага: гэта ўмова не датычыцца ацэнкі з. 1.</td>
<td></td>
</tr>
</table>